Белорусская военная газета. Во славу Родины
30.11.2019

# «Кніжны зубр»

Кацярына Іванова



Так называецца скульптура ў стылі хай-тэк, якая нядаўна з’явілася ў фае Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі.

Матэрыялам для яе паслужылі артэфакты XVIII — сярэдзіны XX ст. — дэталі старых друкарскіх варштатаў і шрыфты. На «поўсць» зубра пайшло каля 2.000 адзінак шрыфту. Зразумела, што прадстаўлены і адметныя літары нашага алфавіта — «і», «ў». Праца мае аўтарскую назву — «Алеф», якая адсылае нас да назвы першай літары старажытных алфавітаў. Важыць волат, зроблены з дрэва і металу, больш за 500 кілаграмаў. Памер — каля метра ў вышыню і паўтара метра ў даўжыню. Сэрца асілка зроблена з дэталяў, адмыслова падабраных так, што яны ўтвараюць сонца і маладзік — добра вядомыя сімвалы Францішка Скарыны, усходнеславянскага першадрукара, нашага слыннага суайчынніка. Аўтар зубра — Генадзь Катлінскі. Стваралася першапачаткова скульптура ў межах праекта Уладзіміра Ліхадзедава «У пошуках страчанага».

Шмат алюзій выклікае кніжны зубр. Сімвалізуе старажытнасць, трываласць нашай культуры, магутнасць друкаванага слова. Скульптура ўспрымаецца і як помнік тым першапраходцам, якія мелі смеласць адважна крочыць у невядомае, спазнаваць новае і дзяліцца ім з чалавецтвам. Францішак Скарына менавіта так калісьці і зрабіў.

Так, на змену металічным літарам прыйшлі пластыкавыя клавіятуры, працэс выдання кніг значна спрасціўся, але, упэўнена, друкаваную кнігу на 100 адсоткаў не заменіць ніякі гаджэт.

«Кніжны зубр» ужо паспеў набыць папулярнасць сярод наведвальнікаў і гасцей Нацыянальнай бібліятэкі, асабліва сярод дзяцей. Пакуль незвычайны зубр — часовы госць у бібліятэцы, але хочацца спадзявацца, што знойдзецца спонсар, які дапаможа зубру атрымаць сталую прапіску ў гэтым будынку.

Фота аўтара